Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# ЧЫРВОНЫ СЦЯГ

Орган Давід-Гарадоцкага РК КП(б)Б і Райвыканкома.

№ 7(11)
Чацвер 15 лютага 1945 года
Цана 15 кап.

13 ЛЮТАГА ВОЙСКІ 2-УКРАІНСКАГА ФРОНТА ПРЫ САДЗЕЙНІЧАННІ ВОЙСК 3-УКРАІНСКАГА ФРОНТА ЗАКОНЧЫЛІ ЛІКВІДАЦЫЮ АКРУЖАНАЙ ГРУПІРОЎКІ ПРАЦІЎНІКА Ў ГОРАДЗЕ БУДАПЕШЦЕ —СТАЛІЦЫ ВЕНГРЫІ.

СЛАВА ГЕРАІЧНАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ!

## ЛЕСАНАРЫХТОЎКІ І ЛЕСАВЫВАЗКІ.

САКРАТАРУ ПІНСКАГА ОБКОМА ПАРТЫІ—т. КЛЯШЧОВУ.

СТАРШЫНЕ ОБЛВЫКАНКОМА—т. КРАСОЎСКАМУ.

Працоўныя Давід-Гарадоцкага раёна, натхнёныя перамогамі гераічнай Чырвонай Арміі, громячай фашысцкага звера ў яго ўласным логаве, у падарунак 27-ай гадавіне РСЧА датэрмінова выканалі план лесанарыхтовак і лесавывазкі 1-га квартала 1945 г. на 100 працэнтаў.

Нарыхтоўкі і вывазка лесу прадаўжаюцца.

САКРАТАР ДАВІД-ГАРАДОЦКАГА РК КП(б)Б—НЕСЦЮК.

СТАРШЫНЯ ВЫКАНКОМА РАЁННАГА СОВЕТА—БАРСУКОЎ.

11. 2. 45 г.

## Падрыхтавацца к веснавой сяўбе

Паспяховае правядзенне веснавой сяўбы залежыць ад таго, наколькі будзе своечасова і добраякасна праведзена падрыхтоўчая работа ў зімовыя месяцы.

За гэтыя астаўшыеся дні неабходна поўнасцю адрамантаваць сельскагаспадарчы інвентар, ачысціць і засыпаць насенне, падрыхтаваць цяглавую сілу, вывезці гной на палі.

Не ўсё яшчэ ў парадку і з землёй. У некаторых сельсоветах (Лядзецкім, Рэмельскім) да сяго часу не закончаны работы па звароту зямельных участкаў малазямельным сялянскім гаспадаркам, якія былі ў іх адабраны нямецкімі захопнікамі ў час акупацыі.

Фашысцкія вырадкі аграбілі сялян. Большую частку рабочых коней і валоў адабралі і ўгналі ў Германію. Тысячы плугоў, баран і іншых машын згарэла. У выніку гэтага на кожныя 3 гаспадаркі прыпадае адзін конь, адзін плуг і барана, на 9 гаспадарак—вол.

Недахоп цяглавай сілы, інвентара, адсутнасць насення ў некаторых гаспадарках, патрабуе ад РайЗА і старшынь сельсоветаў прыняцця неадкладных мер к вырашэнню гэтых пытанняў.

Бяздзейнасць РайЗА (Машлякевіч) прывяла к таму, што да сяго часу не арганізавана ніводнага сартыровачнага пункта. З маючыхся ў раёне 3 сартыровак, дзве няспраўныя.

Уся падрыхтоўка к веснавой сяўбе павінна праводзіцца з такім разлікам, каб забяспечыць выкананне плана веснавой сяўбы ва ўстаноўлены тэрмін і дабіцца павышэння ўраджайнасці.

## Франтавое заданне выканана

На гістарычныя перамогі гераічнай Чырвонай Арміі, дабіваючай фашысцкага звера ў яго ўласным логаве, працоўныя нашага раёна адказалі новымі перамогамі—усенароднай дапамогай фронту.

На 10 лютага раён датэрмінова выканаў франтавое заданне 1-га квартала па нарыхтоўкам і вывазцы лесу. Рад сельскіх советаў: Рубельскі (старшыня Пашкевіч К.) к гэтаму тэрміну выканаў план на 120 працэнтаў, Лядзецкі (старшыня Скрабец П.)—на 110 працэнтаў, Хорскі (старшыня Брышчук В.)—на 104.

У ходзе лесанарыхтовак і лесавывазкі колькасць стаханаўцаў вырасла да 100 чалавек. Лепшыя з іх, як Якімовіч С., Труханавіч А. Е., Баскунец Ф. І., Якімовіч Анна, Слуцкі Л. (Хорскі сельсовет), Зельманчук І. І., Шыкунец І. З., Вярэвіч І. Д., Семенчук К. А. (Лядзецкі сельсовет), Пушкар П. Н., Лятун І. Н. (Давід-Гарадок), Васішчэвіч І. С., Вабішчэвіч Ольга, Рэзановіч Я. І., Огневіч І. К. (Рубельскі сельсовет) сваей працай заваявалі славу і пашану.

Але такія сельсоветы, як Веляміцкі, Аздаміцкі, Рэмельскі і Давід-Гарадок яшчэ не давыканалі плана лесанарыхтовак і лесавывазкі. Гэтым сельскім советам трэба прыняць усе меры к хутчэйшаму выкананню франтавога задання.

М. Барсукоў,
Старшыня райвыканкома.

## На 591 працэнт

План па пабудове мастоў па нашаму раёну ў 1944 годзе выканан на 591 працэнт. Замест 89 пагонных метраў пабудавана мастоў працягласцю на 526 метраў.

За перавыкананне плана па будаўніцтву мастоў у 1944 годзе, лепшыя стаханаўцы: дарожныя майстры Стаднік І. М., Грычык І. І., плотнікі Шэпецька К. М., Марчук А. І., Петравец Ф. С. і Шэпецька Г. І. прадстаўлены к прэміраванню.

І. Каяфюк.

# Вынікі алімпіяды

10 лютага закончыўся агляд мастацкай самадзейнасці раёна, у якім прынялі ўдзел калектывы вучняў НСШ №1, НСШ №2, Лядзецкай, Турскай, Лісовіцкай і другіх школ раёна.

Па свайму аб'ёму, зместу і мастацкаму выкананню першае месца ў раёне заняла самадзейнасць вучняў НСШ №2, другое—НСШ №1.

Добра былі выкананы харавым гуртком НСШ №2 песні: „О Сталине,“ „В бой за Родину,“ „Сулико“ і іншыя.

Сярод прадэманстрыраваных на алімпіядзе танцаў трэба адзначыць „Яблычка“ і „Сіні платочак“, выкананыя вучаніцамі IV класа НСШ №1 Паўлюк Соняй і Самсановіч Лідай, а таксама „Крыжачок“ і кітайскі народны танец „Чын-Чан“ у выкананні вучаніц НСШ №2 Марэйка С., Галавач Н., Кулага Н., Кандыба Т., Дрозд Н., Казакевіч В.

Як недахоп, трэба адзначыць то, што ў алімпіядзе не прымалі ўдзел дарослыя, а толькі вучні. Камсамольскія арганізацыі, за выключэннем НСШ №1, стаялі ў баку ад гэтага важнейшага мерапрыемства. Гэта гаворыць аб адсутнасці належнага кіраўніцтва і ў першую чаргу камсамольскіх арганізацый, справай разгортвання мастацкай самадзейнасці.

Не гледзячы на адсутнасць патрэбнай арганізаванасці і парадку ў час правядзення агляду, прайшоўшая алімпіяда вызвала вялікі інтарэс у працоўных і натхніла моладзь і вучняў на далейшае разгортванне мастацкай самадзейнасці ў раёне.

Наша задача—разгарнуць работу па стварэнню гурткоў мастацкай самадзейнасці пры кожным прадпрыемстве, школе, хаце-чытальні, расціць і развіваць народныя таланты.

Т. Ніколенка.

## ПАДАРУНКІ ВОІНАМ ФРАНТАВІКАМ

Працоўныя Ольгомельскага сельсовета к дню 27-ай гадавіны Чырвонай Арміі рыхтуюць падарункі для воінаў—франтавікоў.

Ужо адпраўлена першая партыя падарункаў вагой у 72 кг.

Збор працягваецца.

І. Белясніцкі.

## РАДЫЁФІКАЦЫЯ РАЁНА

Існуючы радыёвузел у райцэнтры ў даны момант трансліруе радыёперадачу па 142 точкам. У горадзе ўстаноўлена два моцных рэпрадуктары—на базарнай плошчы і ў цэнтры горада.

Акрамя гэтага, у чатырох сельскіх советах устаноўлены рэпрадуктары і кожны дзень па тэлефоннай лініі перадаюцца апошнія паведамленні.

У бліжэйшыя дні заканчваецца абсталяванне радыёстудыі. Усё патрэбнае абсталяванне і апаратура ўстаноўлена і ў хуткім часе пачне працаваць меснае радыёвяшчанне.

В. Кірыс.

## НЕКАТОРЫЯ ЗАЎВАГІ АБ АЛІМПІЯДЗЕ

Праглядваючы мастацкую самадзейнасць вучняў на алімпіядзе, прыходзіш к вываду, што нашы дзеці і настаўнікі многа папрацавалі над паасобнымі нумарамі і дабіліся значных вынікаў. Усё гэта добра.

Але хто даў права кіраўнікам школ і ў прыватнасці загадчыку Рай АНА т. Ніколенка трымаць дзяцей да 12 гадзін ночы ў ДСК?

Гэта ёсць прамое нарушэнне пастановы Райвыканкома і ўсіх педагагічных правіл.

Паказ самадзейнасці трэба было праводзіць па ўзростам, улічваючы тое, што добра для вучняў старэйшых класаў, то ні у якай меры не трэба было паказваць вучням першых класаў.

Усе гэтыя парушэнні ў далейшым не трэба дапускаць.

Мл. лейтэнант Барысаў.

## У НАРСУДЗЕ

На гэтых днях нарсуд разгледзеў справу аб нарушэнні працоўнай дысцыпліны заг. магазіна №5 Паповай І. Н., якая 1 лютага спазнілася на работу на 35 мінут.

Нарсуд асудзіў Папову к 4-м месяцам папраўча-трудавых работ па месцу службы з вылічэннем 25 працэнтаў з зарплаты.

Н. Таранава.

## ПА РАЁНУ

6 студзеня ў памяшканні парткабінета для партыйна-совецкага актыва была прачытана маёрам Юлевічам лекцыя на тэму: „Ваенна-палітычнае і міжнароднае становішча Совецкага Саюза“.

На лекцыі, якая прайшла з вялікім поспехам, прысутнічала звыш 80 чалавек.

І. Дубіеў.

* * *

У вёсцы Ольпень, Веляміцкага сельсовета, пачала сваю работу хата-чытальня.

Хата-чытальня забяспечана літаратурай і газетамі.

С. Ключнікаў.

* * *

Пры РайАНА пачалі працаваць 7-мі месячныя педагагічныя курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў для 1-4 класаў школ раёна.

На курсах навучаецца да 40 чалавек.

Н. Ротко.

## ПАРА ПРАЧНУЦЦА.

Больш 6 месяцаў, як выбрана рэдкалегія насценгазеты пры Райвыканкоме. Рэдактар Семянцоў і члены рэдкалегіі да сягоння часу бяздзейнічаюць і не выпусцілі ніводнага нумара газеты.

Даўно пара т. Семянцову прачнуцца і ўзяцца за выпуск насценгазеты.

К. І.

## АД РЭДАКЦЫІ

Рэдакцыя звяртае ўвагу сакратара пярвічнай партарганізацыі райвыканкома т. Харлана на гэты факт бяздзейнасці рэдкалегіі

Адказны рэдактар А. Плаўчанка.

17 лютага ў райцэнтры, у памяшканні РК КП(б)Б, адбудзецца раённы СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРЧЫ комсамольскі сход.

Яўка ўсіх комсамольцаў раёна—абавязкова.

РК ЛКСМБ.

Адрас рэдакцыі: г. Давід-Гарадок, вул. Талстога. 50.